Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

ЭКСКУРСІЯ НА ФЕЛЬЧАРСКА – АКУШЭРСКІ ПУНКТ
(канспект экскурсіі)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост дзяцей: 4-6 гадоў;

Тып маршруту: пешы

Працягласць па часе: 1г.

Адлегласць: 400 м.

Маршрут: дзіцячы сад – фельчарска – акушэрскі пункт – дзіцячы сад;

Мэта: пазнаёміць дзяцей з прафесіяй медыцынскага работніка, размяшчэннем і абсталяваннем медыцынскага кабінета; пазнаёміць з некаторымі медыцынскімі прыладамі і іх прызначэннем. Выхоўваць павагу да працы медработніка. Пазнаёміць з асновамі першай медыцынскай дапамогі.

Ход занятку.

Дзеці, сёння мы з вамі адправімся ў падарожжа, а ў якое, даведаецеся, калі адгадаеце загадку.

Як лячыцца гаворыць ён усім.

Калі хворы - міксутуру прапануе прыняць,

Таму, хто здаровы - дазволіць пагуляць?

Так, мы з вамі пойдзем на фельчарска – акушэрскі пункт.

Наш шлях пачынаецца з руха па вуліцы. Давайце паўторым, як правільна ісці па вясковай вуліцы.(Дзеці паўтараюць правіла бяспечных паводзін на вуліцы).

Каля фельчарска – акушэрскага пункта.

Успомніце, як завуць нашу медыцыскую сястру? (Галіна Уладзіміраўна). Яна прывыкла, што да яе на пункт прыходзяць дзеці, якім патрэбна яе дапамога. Але сёння мы ідзём не па дапамогу, а ў госці да Галіны Уладзіміраўны. Давайце ўспомнім, як паводзяць сябе выхаваныя людзі ў гасцях? І, вядома, мы не забудзем прывітацца, бо мы ўсім жадаем добрага дня, і Галіне Уладзіміраўне - таксама.

Дзеці заходзяць у памяшканне.

Выхавальнік звяртае ўвагу на размяшчэнне кабінета медсястры (кушэтка, ростамер, шалі, шафа з лекамі, стол з перавязачнымі матэрыяламі) і працэдурнага кабінета (кушэтка, столік для прылад).

Падчас экскурсіі медсястра расказвае аб сваёй рабоце, аб тым, з якімі праблемамі да яе звяртаюцца дзеці, паказвае, як правільна апрацаваць рану і зрабіць павязку. Медсястра паказвае шафу з перавязачнымі матэрыяламі, знаёміць з назвамі "бінт", "пластыр", "вата", "сурвэтка". Паказвае флаконы з перакісам вадароду, ёдам і зялёнкай. З дапамогай шпатэляў правярае горла ў дзяцей. Па просьбе выхавацеля дае пакарыстацца на час фанендаскоп, каб пазней дзеці змаглі паслухаць, як стукае іх сэрца. На развітанне Галіна Уладзіміраўна жадае ўсім дзецям моцнага здароўя і частуе іх вітамінкамі.

Замацаванне матэрыялу.

Гульні ў гульнявой зоне «Бальніца»;

Гульня "Прыходзьце да нас лячыцца".

